# ДЗІЦЯЧЫ КАМБІНАТ У САЎГАСЕ

Праблема дзіцячых ясляў у калгасах і саўгасах — адна з нявырашаных пакуль што. Асабліва калі пачынаюцца летнія работы, адсутнасць дзіцячых садоў-ясляў надзвычай адчувальна. Так было і ў саўгасе «Свабода». Адсутнасць прыгляду за маленькімі дзяцьмі скоўвала жанчын, прымушала іх сядзець дома з малышамі.

Ганна Майсееўна Баранава лічылася лепшай работніцай у кансервавым цэху вінзавода. Дзеці Юра і Люда ўжо падраслі крыху, могуць пабыць дома і адны. Ды вось у сям'і паявіліся блізняты. Жанчыне амаль цэлы год прыйшлося сядзець дома з малымі. Муж Віктар Мартынавіч працуе ў будаўнічай брыгадзе саўгаса. Безумоўна, аднаму забяспечваць сям'ю, ды прытым не малую, не так лёгка. Прыйшлося шукаць дзецям няньку. Не раз, сабраўшыся пасля работы,жанчыны ўздыхалі: «вось бы яслі ў саўгасе адкрылі, зусім іншае было б».

Ведалі аб гэтым і дырэкцыя саўгаса, і рабочы камітэт, і партыйная арганізацыя. Думалі, раіліся, за які кошт пабудаваць дзіцячы камбінат. Нарэшце, сродкі знайшліся.

Цяпер ужо радасць прыйшла і да маленькіх. У цудоўнай мясціне Пагосцкага парка, што напоўнен водырам расцвіўшага бэзу, «вырас» добротны будынак дзіцячага сада-ясляў. Як толькі тут пачала працаваць медыцынская камісія па агляду маленькіх навасёлаў, некаторыя з іх ішлі самі. Ларыса Плешко жыве з татам і бабуляй. Тата працуе шафёрам саўгаса. Бабулі старой цяжка даглядаць унучку. Цэлымі днямі дзяўчынка была прадстаўлена сама сабе. Як толькі яна дачулася, што пачаўся медыцынскі агляд, адразу ж прыйшла да цёцяў у белых халатах: «Хачу ў садзік», — сказала дзяўчынка.

І вось 14 мая — дзень адкрыцця камбіната. З розных куткоў вёсак Пагост і Сяльцо разам з маці прыйшлі сюды малышы. Спачатку глядзелі насцярожана на новых цёцяў, якія павінны былі замяніць ім клапатлівых мам. Але калі ўбачылі, колькі новых прыгожых цацак назапашана для іх, пацягнуліся ў залу, і ў розных гульнях, якія прапаноўвалі выхавацельніцы, нават забылі пра мам.

— Усяго спачатку было, — прызнаецца медыцынская сястра Валянціна Георгіеўна Еланская, — былі і слёзы, і радасць, але галоўнае, што ўсе дзеці здаровыя.

Валянціна Георгіўена надзвычай любіць дзяцей. Восем гадоў працавала яна на прыёме з педыятарам у адной з дзіцячых кансультацый Паўночнага Каўказа. І сёння, яна не спускае з рук самых маленькіх гадавалых выхаванцаў. То Рыту Грынюк возьме, патрымае, то Марыйку Баранаву суцешыць, то Лену Прыхожую забавіць.Праўда, Прыхожыя могуць ужо і самі абысціся. Іх тут цэлая сям'я: большая Таня сядзіць побач з меншай Оляй, сочыць, каб тая добра паабедала, іншы раз паднясе цацку самай маленькай сястрычцы Леначцы.

А каб меню было разнастайным, паклапацілася повар Галіна Нікіфараўна Грышчэня. Спадабаліся дзецям і шчаўе на мясным бульёне, і макароны пафлоцкі, і асабліва лянівыя варэнікі.

А Валя Слагада і Юра Вярыга нават дабаўкі папрасілі — вельмі ж ужо смачныя пельмені. Затое Святлана Еланская, можа таму, што мама побач, аставіла палавіну іх на талерцы. Але ж тут падаспела выхавацельніца Марыя Аляксееўна Палтаржыцкая і зазначыла: «А яшчэ Света хацела «мышкай» быць... Вось хто з'есць усё,той і будзе «мышкай». І дзеці стараюцца наперагонкі.

Марыя Аляксееўна даўно марыла працаваць з дзецьмі. Яна завочніца трэцяга курса факультэта пачатковых класаў Мазырскага педінстытута.

— Яшчэ цяжка рабіць высновы, — гаворыць загадчыца камбіната Ніна Аляксандраўна Пліско, — не ўсяго хапае, цеснавата. Аднак гэта вельмі добра, што запрацавалі ў нас садыяслі.

**Л. ДЗЕНІСЮК.**